обычай «инструкций для депутатов» (наказы). Обычай Liberum veto, а также «конфедерации всякого типа и сеймы конфедератские были запрещены Конституцией.

Исполнительная власть осуществлялась Королем и новосозданным органом, который получил название «Охрана прав». Под «Охраной прав» понималось правительство или кабинет министров. Ключевым образом менялся статус монарха. Он объявлялся председателем Сейма с одним голосом и утрачивал право санкционировать законы. Главным изменением была отмена выборности монарха, т.е. фактически феодальная республика превращалась в конституционную монархию.

Конституция провозглашала принцип осуществления правосудия только судом. Однако, по существу, остался сословный характер судебной системы. Высшим судом был Сеймовый суд, который рассматривал дела «против народа и короля».

Конституция РП от 3 мая 1791 г. носила прогрессивный характер и открывала путь для выхода из политического кризиса через демократизацию органов власти. Вместе с тем, по мнению белорусского исследователя М. Чудакова, Конституция РП не успела прижиться, укорениться на белорусских землях и осталась скорей всего «декларацией о намерениях», а не реальным правовым актом.

***В.В. Віннікаў, В.Ю. Паляшчук***
БДЭУ (Мінск)

# ПРЫНЦЫП РЭЛІГІЙНАЙ ТАЛЕРАНТНАСЦІ — ВАЖНЕЙШЫ КАНСТЫТУЦЫЙНЫ ПРЫНЦЫП СТАТУТНАГА ЗАКАНАДАЎСТВА КАНЦА XVI — ПАЧАТКУ XVII ст.

Паняцце «талерантнасць» варта разумець як «памяркоўнасць». У якасці крытэрыяў вызначэння узроўня талерантнасці у грамадстве намі вылучаны: умяшанне дзяржавы ў рэлігійную сферу, якое вызначаецца неаднолькавым стаўленнем улад да розных веравызнанняў; уцягнутасць царквы ў дзяржаўную палітыку; юрыдычная рэгламентацыя рэлігійнага жыцця, а таксама выкананне прынятых заканадаўчых актаў; колькасць канфліктаў на этнаканфесіянальнай глебе у той ці іншы перыяд.

Асаблівасцю хрысціянізацыі старажытных княстваў на тэрыторыі Беларусі было тое, што гэты працэс расцягнуўся на доўгі час і завяршыўся толькі у сярэдзіне XIII ст. Хрысціянская ідэалогія не выціснула язычніцтва, а напластавалася на яго, вызваўшы такую з'яву, як двухвер'е. Яна зацвярджалася ў свядомасці нашых продкаў праз пераплячэнне і супастаўленне з традыцыйным язычніцтвам.

Суіснаванне адначасова язычніцкіх традыцый і двух напрамкаў хрысціянства спрыяла развіццю талерантнасці старажытных жыхароў нашай айчыны, фарміраванню своеасаблівага іх менталітэту. Гэтыя фактары не маглі не ўздзейнічаць на правядзенне дзяржаўнай палітыкі, што асабліва яскрава праявілася ў Вялікім княстве Літоўскім.

Абагульняючы ўсё сказанае вышэй, можна адзначыць наступныя вытокі прававога замацавання прынцыпу рэлігійнай талерантнасці ў заканадаўстве XVI — пачатку XVII ст.:

• геапалітычны матыў. Дзяржава і права ВКЛ развіваліся на памежжы трох макрарэгіёнаў: праваслаўна-візантыйскага, каталіцка-раманскага, а з XVI ст. і пратэстанцка-германскага, уяўляючы сабой сінтэз запазычанага і самабытнага звычаёвага і пісанага права, выпрацаванага на грунце гістарычна перспектыўнай дактрыны талерантнасці;

• гістарычны матыў. Зацвярджэнне рэлігійнай талерантнасці ў заканадаўстве ВКЛ праходзіла шляхам рэалізацыі працяглага ў часе заканадаўчага працэсу, які меў наступныя вехі:

– дыскрымінацыя праваслаўных на карысць каталікаў (граматы Ягайлы 1387 г., I Гарадзельскі прывілей 1413 г.);

– спробы выхаду з патавага становішча і дасягненне дзяржаўна-рэлігійнай раўнавагі — Гродзенская грамата 1432 г., «малая феадальная канстытуцыя» Аляксандра 1492 г. і грамата Жыгімонта ад 1506 г.;

– адлюстраванне рэлігійнай роўнасці ў Статутах 1529, 1566 гг. і яе зацвярдженне ў акце Варшаўскай канфедэрацыі і статуце 1588 года.

У Статуце 1529 года ва ўступе акрэслена норма, якая нівеліравала гістарычна абумоўленную розніцу прававога становішча каталікаў і праваслаўных: «Коренным жителям земель нашего Великого Княжества Литовского [...] все их права и церковные привилеи как для лиц католического, так и православного вероисповедания, а также светские привелеи ими полученные, желаем считать имеющими силу». Раўнапраўны падыход да прадстаўнікоў абедзвюх канфесій падкрэсліваўся і ў другім літоўскім Статуце 1566 г.

Яшчэ далей пайшлі складальнікі акта Варшаўскай канфедэрацыі, які быў потым уключаны ў Статут 1588 г.

Рэлігійны плюралізм зацвярджаўся ў наступным палажэнні: «... абяцаем [...] што мы, якія з'яўляемся рознымі ў веры, мір паміж сабой захоўваць, а ў сувязі з розніцай веры і адрозненнем ў цэрквах крыві не праліваць і не караць адсуджэннем маёмасці, пазбаўленнем гонару, турэмным зняволеннем і выгнаннем».

У адрозненні ад папярэдніх норм заканадаўства, у якіх зацвярджалася роўнасць паміж каталікамі і праваслаўнымі, акт Варшаўскай канфедэрацыі (а пазней і Статут 1588 г.) усталёўвае рэлігійную талерантнасць у дачыненні да ўсіх веравызнанняў.

Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by